«Мы — выжылі»

«Турэмныя дзённікі» Вольгі Класкоўскай. Частка 21: Як паручык Ржэўскі на палкоўніка напаў

Грамадства 08.09.2023

Вольга Класкоўская

У папярэдніх частках дзённікаў я згадвала пра «непрыкметных супрацоўнікаў» гомельскай калоніі, а таксама, з якой прапановай палітвязні хацелі звярнуцца ў рэдакцыю «Новага Часу». Сёння распавяду, пра што думаецца ў часе знаходжання ў ШІЗА, як палкоўнік УДВП здаў начальніка следчага ізалятара, і за што пасадзілі жонку падпалкоўніка КДБ.



Папярэднія часткі «Турэмных дзённікаў» Вольгі Класкоўскай

«Дайте мне одеяло и умереть»

У камерах ШІЗА і ПКТ я правяла амаль што пяць месяцаў.

Апынуўшыся ў штрафным ізалятары ўпершыню, напачатку адчуваеш нейкі спакой, як ні дзіўна. Жыццё ў калоніі вельмі шумнае: ты ўвесь час сярод вялікай колькасці людзей, не маеш ніякай асабістай прасторы. Застацца аднаму хаця б на непрацяглы час ніяк не выпадае. Толькі хіба што ў прыбіральні — і тое, усяго на некалькі хвілін, бо калі затрымаешся ў кабінцы надоўга, асуджаныя ўзнімуць лямант, маўляў, ну колькі можна, давай ужо выходзь.

У нашым атрадзе было чатыры ўнітазы на сто чалавек. Каб туды патрапіць у так званыя гадзіны пік (раніца і вечар), трэба было выстаяць немаленькую чаргу. Днём было прасцей, таму я часта заходзіла ў кабінку проста, каб пабыць адной, і хоць на некалькі хвілін

жаночы голас з надрывам распавядае асуджаным пра іх правы і абавязкі. Гэтае «маралітэ» ад людзей у пагонах круціцца па другім, трэцім, чацвёртым коле — пакуль у чалавека не пачынаецца панічная атака.

Але бывалі ў ШІЗА і зусім ціхія дні. І ў першыя моманты, як я ўжо казала, ты атрымліваеш асалоду ад такой ізаляцыі. Але пасля першай ночы на халоднай дошцы без якой-кольвек пасцельнай бялізны, фактычна без сну, акалелы, ты ўжо нічому не рады.

Пра што думаецца ў камеры штрафнога ізалятара? Што дапамагае трымацца?

Адчуванне падтрымкі — ад сям'і, сяброў, аднадумцаў, паплечнікаў. Гэтая падтрымка адчувацца нават праз сцены. Вядома, што ў нейкія хвіліны і апатыя накрывае, і адчай, і ўсё бачыш у чорных колерах, і рукі апускаюцца… Але ўсімі сіламі сябе з такога стану трэба выцягваць. Не дазваляць, каб меланхолія засмактала цябе, як у дрыгву, апанавала табой. Цяжка захоўваць аптымістычны, радужны настрой, калі цябе катуюць, але трэба змагацца не толькі з сістэмай, але і самім сабой і ўзняцца над гэтымі абставінамі. Калі цалкам упадзеш духам — гэта катастрофа, ты не выжывеш.

У засценках ШІЗА і ПКТ я шмат марыла і фантазіравала, візуалізавала — прыдумляла і згадвала розныя рамантычныя гісторыі, думала пра дзень вызвалення, пра тое, як выходжу за турэмную браму — а там мяне сустракае шмат людзей з бел-чырвона-белымі сцягамі, гучыць «Пагоня», і мае аднадумцы гавораць, што рэжым нарэшце зрынулі, што сілы дабра перамаглі, што ў Беларусі новая ўлада і Святлана Ціханоўская падпісала ўказ пра тэрміновае вызваленне ўсіх

адчувала ў гэтыя моманты. Аднекуль раптам з'яўлялася цёплы паток, які расцякаўся па ўсім целе, і пачынаў саграваць цябе, акалелага і сіняга. І гэта не метафара: так было насамрэч. Як гэта патлумачыць, я не ведаю.

Шмат думала пра сям'ю, сяброў. Успамінала пратэсты 2020 года, учынкі, вочы людзей, з якімі мы побач ішлі ў шыхтах на акцыях. І вялікі гонар браў за народ, вельмі моцна пачынала калаціцца сэрца — гэта было сапраўднае народнае паўстанне, на вуліцы выйшла столькі смелых, мужных, цвёрдых, шчырых людзей з пачуццём уласнай годнасці!

Адчуванне, што ўсё было недарэмна, дапамагала трымацца за кратамі. Нават калі ўжо зусім не было сіл — я згадвала вочы людзей, з якімі мы разам ішлі на Маршах, і сілы зноў аднекуль браліся.

Вельмі шкодна ў штрафным ізалятары думаць пра ежу. Такія думкі трэба гнаць ад сябе. А яны ўвесь час, як наліха, прыходзяць: ты заўсёды галодны, усяго пазбаўлены, і хочацца хаця б у марах чымсьці падсілкавацца, з'есці якія-небудзь прысмакі.

Я часта марыла пра кубачак духмянай кавы з вяршкамі і глазураваны сырок. Назойлівыя думкі пра ежу выклікалі бурчанне ў жываце і хацелася зглынуць сліну. Мары пра ежу ўганялі ў яшчэ большую дэпрэсію. Праз нейкі час я навучылася пра яе не думаць. Няма сэнсу ў такіх фантазіях, бо псіхалагічны стан праз іх яшчэ больш пагаршаецца.

Я так і не навучылася не марыць пра коўдру. Замярзаючы ў ШІЗА, увесь час згадвала словы закатаванага на Акрэсціна хлопца: «Дайте мне одеяло и умереть». Як я яго ў гэты момант разумела.

столькі іншых людзей! А ну, хуценька, узяла сябе ў рукі!»

І гэта дзейнічала.

Паручык Ржэўскі супраць палкоўніка

— *Класковская, руки*, — грозна вымавіў праз «кармушку» мужчынскі голас, пачулася бразгатанне кайданоў.

Брэсцкае СІЗА. Студзень 2022 года. У сукамерніцы Юлі дзень народзінаў. Учора акурат адсвяткавалі мой, юбілейны. Не жыццё, а суцэльныя святы.

На стале — бутэрброды, торт, прысмакі. «Кармушка» адчынілася знянацку, калі хтосьці з дзяўчат акурат прамаўляў тост. Праз раздаткавае акно мне зашпільваюць за спінай кайданкі, кантралёр сурова загадвае «всем построиться», да нас завітаў госць з Упраўлення дэпартамента выканання пакаранняў па Брэсцкай вобласці.

У візіцёра пагоны палкоўніка. Мужчына ўвесь час смяецца, кажа нейкія глупствы. У мяне склалася ўражанне, што ён падвыпіўшы.

— *А это вы у нас тут такая опасная, в наручниках? А за что сидите?* – з фальшывай спагадай звярнуўся да мяне госць.

— *За тое, што люблю сваю краіну*, — адказваю яму.

— *Любите. Но закон не нарушайте,* -- загагатаў той.

— *Дарэчы, наконт закону,* — працягваю дыялог, — *у мяне да вас ёсць*

— А вы ведаеце, што начальнік СІЗА Вашкевіч парушае Канстытуцыю? Ён забараняе мне размаўляць па-беларуску, сцвярджае, што не разумее мовы і што мае звароты па-беларуску ён разглядаць не будзе.

— Очень странно, -- засмяяўся ў адказ палкоўнік Квашэвіч. *— Когда мы с ним учились в Академии милиции, мы изучали там белорусский язык, и он его прекрасно понимал.*

У камеры павісла паўза, заўважна змяніўся выраз твараў світы палкоўніка. Квашэвіч зразумеў, што збалбатнуў лішняга, і паспяшаўся рэціравацца.

— Пачакайце, грамадзянін начальнік, у мяне яшчэ не ўсё, — крычу яму ўслед. *— У нас тут толькі спальныя месцы, а месцаў для сядзення няма. Гэта парушэнне закону. Метраж камеры не адпавядае колькасці асоб, што ў ёй утрымліваюцца. Плюс тут сядзяць людзі з цяжкімі артыкуламі і менш цяжкімі, як у выпадку палітвязняў. Гэта грубае парушэнне. Даводжу гэта да вашага ведама і прашу адрэагаваць.*

Палкоўнік павярнуўся, вельмі блізка падышоў да мяне, у літаральным сэнсе схіліўся нада мной:

— Пра закон заговорили? Так вот надо было раньше о нем думать и не нарушать, — даволі рэзка абсёк мяне Квашэвіч. *— Да, кстати, и с днем рождения,* — нацягнута ўсміхнуўся палкоўнік маёй сукамерніцы і выйшаў прэч.

Андрэй Квашэвіч, палкоўнік Упраўлення дэпартамента выканання пакаранняў па Брэсцкай вобласці.

А мы так і не зразумелі, навошта ён прыязджаў і што хацеў да нас данесці. А таксама, чаму ён увесь час смяяўся. Зараднічалі, што той тыцнуў носам Вашкевіча, ды яшчэ і ў прысутнасці іншых служакаў. І далі яму мянушку «Паручык Ржэўскі».

— Бо ён увесь час іржэ, — патлумачыла мая сукамерніца.

— Да он бухой, девочки. Что я трезвого от пьяного не отличу, что ли? И какой нормальный мент в воскресенье в СИЗО с проверкой поедет? – падзялілася меркаваннем яшчэ адна сукамерніца, жанчына «з цяжкім алкагольным мінулым».

Вясёлы такі палкоўнік, пазітыўны.

Гэты кейс вельмі загадкавы і з вельмі мутным шлейфам.

З **Анастасіяй Хамук** я сустрэлася ў гомельскай калоніі, працяглы час мы сядзелі ў адным атрадзе.

На бірцы — артыкул «здрада дзяржаве». Прысуд — восем гадоў. Адметна тое, што бірка Насты не жоўтая, а звычайнага, белага колеру, як ва ўсіх іншых асуджаных.

Жанчыну асудзілі яшчэ да пратэстаў 2020 года. Паводле яе, за тое, што перадала ўкраінскаму боку інфармацыю, якая «ўяўляе сабой дзяржаўную таямніцу».

У 2019-м арыштавалі і мужа Насты: на той момант ён з’яўляўся дзеючым падпалкоўнікам КДБ. Жанчына сцвярджае, што мужу далі два гады па артыкуле «разгалошванне службовай таямніцы», тэрмін ён адбываў у брэсцкім СІЗА, працуючы ў атрадзе гаспадарчай абслугі. І што былы афіцэр ужо на волі.

У прыватных размовах Анастасія распавядала, што да арышту жыла з мужам у Брэсце, была рамеснікам, выраблялa лялькі ў беларускіх нацыянальных строях, часта ездзіла гандляваць імі ва Украіну. І што нічога, маўляў, яна такога шпіёнскага не рабіла, а ўсяго толькі была сведкам шматлікіх размоў мужа з яго калегамі ў часе застолляў.

Гэты кейс выклікаў у мяне вельмі супярэчлівыя пачуцці. Інтуіцыя падказвала, што рэч тут не столькі ў ідэйнасці, колькі прасочваецца пэўны камерцыйны інтарэс. З пункту гледжання маральна-этычнага, шмат якія дэталі я пакуль што апускаю.

Так ці інакш, але кейс яскрава дэманструе, наколькі гнілая дзеючая сістэма. Спецслужбы пажыраюць адно аднаго. І не ўсё ў гэтых колах так згуртавана, трывала і надзейна, як служакі імкнуцца гэта паказаць.

Інакш пры дыктатуры не бывае. У амаральнай, людажэрнай сістэме не толькі ты пажыраеш нелаяльных, але і цябе ў любы момант свае ж могуць зжэрці.

Працяг будзе

«Мы — выжылі» | Турэмныя дзённікі | правы чалавека | палітвязні

Падзяліцца ў:

«МЫ — ВЫЖЫЛІ»

Грамадства

03.09.2023

Чым скончыўся бунт у бабруйскай калоніі і пры чым тут Бяляцкі

Грамадства 03.09.2023

«Гурток па вывучэнні ангельскай мовы вёў міліцыянт у званні маёра». Гісторыя былога палітвязня

Грамадства 01.09.2023

«Турэмныя дзённікі» Вольгі Класкоўскай. Частка 20: Як мы за кратамі жаніхоў

Грамадства

25.08.2023

«Турэмныя дзённікі» Вольгі Класкоўскай. Частка 19: «Чысты аркуш». Як патроліць турэмнікаў і не трапіць у ШІЗА

«Мы — выжылі»

«Мы — выжылі». Менавіта так могуць сказаць усе тыя, хто прайшоў праз беларускія турмы і калоніі.

«Я павінен быў усё вытрымаць і выжыць, каб абняць сваіх родных, і каб нарэшце дачакацца вольнай Беларусі!», — кажа адзін з тых, каго карная сістэма так і не скарыла.

У Дзень палітзняволеных і другую гадавіну смерці забітага ў калоніі Вітольда Ашурка мы распачалі новы праект.

У ім свае гісторыі распавядаюць тыя, хто прайшоў пекла рэпрэсій. Тыя, хто не гледзячы на невыносныя умовы і

Больш публікацый па тэме >

АПОШНЯЕ НА САЙЦЕ

Ларыса Шчыракова не падавала апеляцыю на прысуд

«Ніводнае дзяржСМІ не скажа: пасля ўборачнай мы фіксуем горшы вынік за дзесяцігоддзе»

«Вайну спыніце, утыркі». Расійскія выбары ператварыліся ў антываенны флэшмоб (фота)

«Беларусам Сабаленка запомніцца не тым, што была першай ракеткай свету»

«Мы імкліва коцімся ў Сярэднявечча». Медыкі — пра праблемы медыцыны ў Беларусі

У Беларусі плануюць скараціць ліміты на пасылкі і ўвоз тавараў з-за мяжы

565-ты дзень вайны. У Расіі будзе новая мабілізацыя. Пытанне — калі

«Happy Birthday, mrs. President». Сёння — дзень народзінаў Святланы Ціханоўскай

Фрустрацыя ябацек. Пра што нам кажуць частыя сваркі ў шэрагах праўладных актывістаў

Як стварайся музей Адама Мішковіча ў Навагрудку: разблытваем таямніцы

Telegram і Facebook!

© 2008-2023 Усе правы абароненыя

Выкарыстанне матэрыялаў дазваляецца пры ўмове спасылкі (для інтэрнэт-рэсурсаў — гіперспасылкі) на «Новы Час» Online

Скантактавацца з намі можна праз email або Telegram-бот

Рэдакцыя можа публікаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў